# Першапачатковы перыяд дзейнасці Віленскага манетнага двара ў часы праўлення Жыгімонта II Аўгуста (1548–1572)



**Андрэй КАРАЧ**

*Член праўлення Беларускага нумізматычнага таварыства, Рэспубліка Беларусь, г. Гродна, e-mail: andrew_karach@tut.by*

З пачаткам княжання Жыгімонта Аўгуста ў Вялікім Княстве Літоўскім (далей – ВКЛ) зноў паўстае пытанне аб адкрыцці манетнага двара і выпуску сваёй уласна літоўскай манеты. З моманту апошніх эмісій прайшло амаль 9 гадоў. Але ад былой мынцы, якая функцыянавала ў 1535–1536 гг., нічога не засталося: не было меннічых прылад, сыравіны і нават будынка, у якім можна было б размясціць будучую манетную вытворчасць.

Спачатку трэба вызначыць месца, дзе знаходзіўся манетны двор *(малюнак 1)*. На карце Вільні 1576 г. з «Атласа гарадоў зямнога свету» аўтарства нямецкага тэолага і дыпламата Георга Браўна (1541–1622) ёсць назвы толькі некалькіх вуліц, відаць, самых галоўных, адна з якіх – Die Muntz, што можна перакласці як «манетная» *(малюнак 2)*. Гэта вуліца выходзіць да ратушы. Тапаграфія цэнтральнай часткі Вільні практычна не змянілася з XVI ст., і сёння гэта вуліца называецца Вокечу (літ. Vokiečių), а раней яна называлася Нямецкай. Вядома, што ў 1545 г. на вуліцы Нямецкай у Вільні для патрэб мынцы за 500 коп літоўскіх грошаў быў куплены мураваны будынак. У гэтай справе прымаў асабісты ўдзел земскі падскарбій Іван Гарнастай [1, с. 163]. Відавочна, што дзесьці тут размяшчаўся манетны двор.

Прыстасаванні для біцця манет прыйшлося набываць у Кракаве і везці ў Вільню. Не было не толькі срэбра, але і грошай для яго набыцця. З самага пачатку быў выкарыстаны вялікі капітал: Іван Гарнастай камандзіраваў у Кракаў для закупкі срэбра скарбнага пісара Фёдара Маноўскага, якому на гэту справу было дадзена 11 973 капы грошай. Ён набыў 3 780 грыўняў і 1 лот срэбра на 27 311 польскіх злотых; акрамя таго, набыў розныя матэрыялы для лігатуры, інструменты для біцця манет. На гэта было выдаткавана 28 348 польскіх злотых (засталося 1 584 злотых). Невялікая частка срэбра была закуплена непасрэдна ў Вільні. На манетны двор паступіла 3 376 грыўняў срэбра, з якога пайшло ў чакан 3 314 грывень [2, с. 470].

У 1546 г. Іван Гарнастай здае справаздачу аб зборы срэбра – спецыяльнага надзвычайнага падатку для ваенных патрэб за 1542 г. Усяго сабрана 21 928 коп і 42 гроша. Цікава, што частка гэтых грошай пайшла *«на потребы до мынцы нашое, яко дому купленья, такъ и на будованья и на истраву даванья на мынцеры и на иные многие розмаитые росходы»* [2, с. 705–706]. Верагодна, што грошай на нармальнае функцыянаванне мынцы ў краіне зусім не было і частку сродкаў, якія прызначаліся на абарону Княства, накіравалі для працы манетнага двара.

17 чэрвеня 1545 г. датаваны дакумент Жыгімонта I Старога (1506– 1548), якім рэгулявалася справа пакупкі срэбра. Згодна з гэтым лістом, для прадухілення ўзаемнай канкурэнцыі ўсё паступаючае срэбра павінна было дзяліцца пароўну на дзве мынцы – кракаўскую і віленскую [3, с. 66–67]. Таксама гэты даку-

Малюнак 1




Карта Вільні 1576 г.

мент быў патрэбны Жыгімонту ІІ Аўгусту для таго, каб свабодна вывозіць срэбра з Польшчы ў Літву, бо да гэтага часу дзейнічала сеймавая пастанова, якая пад пагрозай суровага пакарання забараняла вываз срэбра за межы краіны [4, с. 121].

Хутчэй за ўсё, меннічы персанал цалкам быў запрошаны з Кракава, бо ўсе вядомыя работнікі віленскай мынцы папярэдне працавалі менавіта ў сталіцы Польшчы. У пачатку верасня 1545 г. мынца, верагодна, яшчэ не дзейнічала, бо новы мынцмайстар Энах Олфірэр 15 верасня яшчэ знаходзіўся ў Кракаве. 12 верасня згадваецца меннічы пісар Ёстус Якуб Дэцыюш. У якасці рэзчыка называецца нейкі Мельхіор. Прабірар (імя невядома) пачаў працу з 11 кастрычніка. Прыкладна ў гэты час павінны былі пачаць працаваць і іншыя работнікі ніжэйшага рангу. 14 кастрычніка 1545 г. адбылася першая выплаўка металу на мынцы [5, с. 48; 3, с. 67]. Трэба адзначыць, што ад пачатку абсталявання манетнага двара прайшло літаральна некалькі месяцаў. Вельмі кароткі тэрмін для такой складанай працы паказвае, што Жыгімонтам ІІ Аўгустам была пастаўлена задача як мага хутчэй выбіць манету, якая будзе сведчыць аб з'яўленні новага Вялікага князя.

Кіраваннем мынцы ў першы перыяд яе дзейнасці (11 кастрычніка 1545 г. – 29 мая 1546 г.) павінна была займацца вялікакняжацкая рада, якая, аднак, непасрэдна гэтага не рабіла, а перанакіравала свае абавязкі земскаму падскарбію Івану Гарнастаю. Ён выдаваў сродкі з вялікакняжацкага скарбу на закупку срэбра, медзі і меннічых прыладаў, акрамя таго выконваў яшчэ функцыю кантролю за меннічай дзейнасцю. Аднак адсутнасць прыбытку, незадаволенасць прыбліжаных да Вялікага князя людзей, нежаданне рады займацца гэтай справай прывяло да таго, што Жыгімонт ІІ Аўгуст узяў гэту справу ў свае рукі і даручыў кіраўніцтва мынцай Яну Лютамірскаму, які ў дакументах згадваецца па-рознаму: «скарбнік надворны», «падскарбі дворны», «суперінтэндант мынцы віленскай», «найвысшы спраўца манетнага двара» і інш. [3, с. 67–68; 6, с. 81; 7, с. 35; 2, с. 470]. У яго паўнамоцтвы ўва-

Малюнак 2



Карта Вільні 1576 г. (павялічаны фрагмент)

ходзіла непасрэдна кіраванне справамі мынцы, прыём работнікаў, прызначэнне ім штогадовага або здзельнага заробку. Ён мог даць скарбнаму пісару загад аб павышэнні заробкаў і непасрэдна кантактаваў з гаспадаром па справах мынцы. Таксама ён кантраляваў справаздачы аб дзейнасці манетнага двара. Гэту пасаду ён займаў з 12 чэрвеня 1546 г. да 1 мая 1555 г. Колькі грошай атрымліваў Я. Лютамірскі на гэтай пасадзе напачатку сваёй працы, мы не ведаем, але ёсць звесткі, што ў 1551–1555 гг. яго заробак складаў 300 злотых штогод [6, с. 81–82].

Пастаўку срэбра і медзі на мынцу з 1545 г. ажыццяўляў Севярын Бонэр, пазней (да 1555 г.) гэтым займаўся Ёст Людвіг Дэцыюш. На тэрыторыі Польшчы былі свае радовішчы срэбра. Пасля закрыцця каронных мынцаў, верагодна, усё срэбра, якое дабывалася на олькушскіх радовішчах, паступала на віленскую мынцу. Для кантралявання гэтага працэсу Ё.Л. Дэцыюш з 1548 г. займае яшчэ і пасаду олькушскага жупніка. У перыяд з 12 чэрвеня 1546 г. па 30 снежня 1549 г. закуплена 35 509 грывень срэбра для мынцы на суму 258 289 польскіх злотых, 12 грошаў і 17 пенязяў. У 1550 г. ён даслаў у Вільню 4 800 грыўняў срэбра, у 1551 г. – 2 042, у 1552 г. – 1 888, у 1553 г. – 430, у 1554 г. – 376. З 1555 г. пастаўкамі срэбра займаецца яўрэйская кампанія – новыя арандатары Віленскага манетнага двара [5, с. 56]. Скарбны пісар таксама набываў срэбра ў мясцовага насельніцтва: у 1551 г. – 111 грывень, у 1552 г. – 96, у 1553 г. – 189, у 1554 г. – 1 092. Праца мынцы непасрэдна залежыла ад велічыні паставак срэбра. Ё.Л. Дэцыюш, з'яўляючыся асноўным пастаўшчыком срэбра, не быў звязаны кантрактам, у якім бы адлюстроўвалася колькасць паступаючага срэбра. Недахопу медзі наогул не адчувалася, бо не існавала ніякіх праблем з яе закупкай. Меннічы пісар у меншай ступені займаўся гэтай справай [4, с. 119–122]. Трэцяй крыніцай паступлення срэбра на мынцу было зняцце з грашовага абарачэння свідніцкіх паўгрошаў і іх паступленне на пераплаўку [8, с. 38–39]. Непасрэд-

на апошняй справай займаўся Ё.Л. Дэцыюш, які дасылаў у Вільню срэбра для мынцы ўзамен на выкупленыя ў ВКЛ свідніцкія паўгрошы. За перыяд з 4 кастрычніка 1546 г. па 9 студзеня 1548 г. Ё.Л. Дэцыюш замест свідніцкіх паўгрошаў на суму 90 400 фларынаў даслаў у Вільню срэбра на суму 82 380 фларынаў і 12 грошаў [5, с. 55–56]. Па звестках адміністратара надворнага скарбу Станіслава Улошкі, некалькі разоў са скарбу паступалі ў мынцу талеры ў якасці сыравіны для далейшай пераплаўкі. Так, 14 ліпеня 1546 г. Я. Лютамірскі атрымаў 1 000 талераў вартасцю 1 066 фларынаў і 20 грошаў, 24 жніўня 1546 г. – 19 400 талераў (або 20 693 фларыны і 10 грошаў) [5, с. 56–57].

На падставе аналізу меннічых рахункаў Міхал Гражынскі падзяляе ўсіх работнікаў мынцы на тры катэгорыі: «чыноўнікі», «таварышы» і «меннічая чэлядзь». Да першай катэгорыі адносіліся: меннічы пісар, мынцмайстар, прабірар і рэзчык (гравёр). Да другой – мынцары (5–6 чалавек) і чалавек, які адказваў за адбельванне манет (pobielacz), да трэцяй – чалавек, які выконваў самую разнастайную фізічную працу (parobek), і кухарка. Не аднесены ні да якой катэгорыі каваль і вугальшчык (węglarz). Асноўным абавязкам скарбнага пісара было вядзенне кнігі прыходна-расходных аперацый. У гэтай кнізе ён таксама занатоўваў інфармацыю, якая датычыла дзейнасці мынцы. Таксама пісар быў адказны за закупку срэбра, медзі і выдачу потым у патрэбнай колькасці мынцмайстру (у гэтай справе былі пэўныя цяжкасці: часта прыходзілася купляць срэбра дробнымі партыямі ў мясцовых жыхароў). Ён прысутнічаў падчас узяцця прабірарам пробы сплаву (дакладна запісваў інфармацыю пра рэшткі металу, страты ў агні) і пры выліванні металу ў формы, кантраляваў далейшы працэс адбельвання і колькасць гатовых манет – сачыў за ўсімі этапамі вытворчасці манет і запісваў у кнігу ўсе недакладнасці і памылкі работнікаў. Таксама ў яго былі і фінансавыя абавязкі: выплата заробкаў, набыццё патрэбных меннічых інструментаў і самага неабходнага для функцыянавання манетнага двара – дроў, воску, солі, тканіны і г. д. Скарбны пісар меў вышэйшае службовае становішча, чым, напрыклад, мынцмайстар, бо апошні падлягаў кантролю з яго боку.

У 1546–1547 гг. на мынцы працаваў нейкі Ваўрынец Елітоўскі, аб ім захавалася зусім мала звестак, але ў дакументах ён называецца «notarius Domini Lutomierski» або «cambiator monetae swidnicensis» [6, с. 82]. Гэта звязана з тым, што яму прыйшлося кіраваць аперацыяй па скупцы свідніцкіх паўгрошаў [8, с. 38–39]. Таксама ён выконваў частку працы меннічага пісара, але быў больш пасярэднікам паміж ім і кіраўніцтвам мынцы [6, с. 82–83]. Пасаду, якую ён займаў, можна акрэсліць як адміністратар.

У 1545–1549 гг. пасаду меннічага пісара займаў Ёстус Якуб Дэцыюш. У перыяд з 11 кастрычніка 1545 г. па 26 лютага 1547 г. яго тыднёвы заробак складаў 2 капы і 24 літоўскіх гроша, а пасля – 3 капы літоўскіх грошаў. За ўвесь перыяд працы яму было выплачана 1 518 польскіх злотых (адзін злоты быў роўны 30 грошам) і 20 грошаў. З 1 студзеня 1550 г. наступным пісарам стаў Марцін Конрат, заробак якога да 31 снежня 1552 г. складаў 3 польскіх злотых за тыдзень, пасля да 10 жніўня 1555 г. – 4 польскіх злотых [6, с. 83].

З моманту адкрыцця мынцы ў 1545 г. і да самага канца 1549 г. абавязкі мынцмайстра выконваў Энах Олфірэр, а з 1 студзеня 1550 г. да 1 мая 1555 г. – Ежы Бём. Мынцмайстар кіраваў тэхнічным бокам вырабу манет, браў ад пісара срэбра і медзь, браў пробы сплаву разам з прабірарам, выцягваў метал у пруты, сачыў за раскаткай металу ў лісты, адбельваннем і біццём манет. Таксама мынцмайстар абавязаны быў весці запісы ўсіх праведзеных аперацый (як і пісар): колькі паступіла металу ад пісара меннічага, колькі было страчана ў агні, кузні і колькі было выбіта манет. Даваў звесткі пісару аб колькасці патрэбных меннічых інструментаў, якія ламаліся. Тыднёвы заробак Э. Олфірэра складаў 2 капы і 24 гроша, а Е. Бём за гэты ж тэрмін атрымліваў крыху больш – 3 капы [6, с. 83].

Важную ролю на мынцы адыгрываў прабірар, які сачыў за тым, каб будучыя манеты былі адпаведнай пробы. У перыяд з 11 кастрычніка 1545 г. па 29 мая 1546 г. гэту пасаду займаў невядомы нам чалавек, аднак разам са сваім памочнікам (які працаваў 7 тыдняў) за 33 тыдні яны атрымалі заробак у суме 55 коп і 36 грошаў. У наступныя чатыры гады сталага прабірара не было, аб чым сведчыць адсутнасць звестак аб яго заробку за гэты тэрмін. 28 чэрвеня 1550 г. з Кракава прыехаў каралеўскі прабірар Фолтын Мюллер, які займаў гэтую пасаду да 1 мая 1555 г. Штотыднёвы яго заробак складаў 3 злотых і шэраг іншых выплат [9, с. 103].

У першае дзесяцігоддзе функцыянавання мынцы вядомы імёны трох гравёраў. Мельхіор працаваў з 1 снежня 1545 г. па 30 кастрычніка 1546 г. Штотыднёвы яго заробак складаў 1 капу і 36 грошаў. Валенты Франк выконваў пробныя працы яшчэ пры сваім папярэдніку, а з 1 лістапада 1546 г. па 23 студзеня 1552 г. быў асноўным гравёрам. У розныя перыяды яго заробак мяняўся і складаў 5–7 польскіх злотых. Наступны гравёр Марцін Вартэнберг заступіў на гэту пасаду 30 студзеня 1552 г. Яго

штотыднёвы заробак складаў 2–2,5 злотага [9, с. 103–104].

Да «таварышаў меннічых» адносіліся памочнікі мынцмайстра – мынцары і адбельвальшчык. Колькасць мынцараў у першыя гады функцыянавання мынцы невядома. У 1551 г. іх было пяць: Генрых фон Гессэн, Фларыян Крамэр, Клаус Меркер, Францішак Мюллер і Філіп Холкнэр. У такім складзе яны працавалі 4 гады, пачынаючы з 1548 г. У 1552 г. іх было шасцёра: прыбыў новы мынцар Горгэн Малахадэйн і замест К. Меркера стаў Лорэнц Розэнберг. У 1553 г. зноў змяніўся іх склад – Г. фон Гессэна і Ф. Крамэра замянілі Шыман Ляшэк і Міхал Геллер. У 1554 г. месца Г. Малахадэйна заняў Альбрэхт Гаусман. Заробак іх залежаў ад прадукцыйнасці мынцы. Так, у 1551 г. ён склаў 486 польскіх злотых, 20 грошаў і 4 пенязі, у 1552 г. – 431 злоты, 7 грошаў і 5 пенязяў. У тыя перыяды, калі мынцары не працавалі, з дазволу Я. Лютамірскага яны атрымлівалі штотыднёва па 12 грошаў. Функцыі адбельвальшчыка ў першае дзесяцігоддзе выконваў чэшскі майстар Лорэнц, які за сваю працу штотыднёва атрымліваў 15 літоўскіх грошаў. Адметную ролю адыгрываў каваль Гжэгаж. Ён займаўся найперш тым, што рамантаваў меннічыя прылады працы. Яго тыднёвы заробак залежаў ад аб'ёму выкананай працы. Да 16 ліпеня 1552 г. вугальшчыкам на мынцы працаваў нейкі Андрэй [9, с. 104–105].

Акрамя пастаянных работнікаў былі і часовыя, якія дапамагалі асноўным работнікам і выконвалі розныя гаспадарчыя абавязкі. З 1551 г. у рахунках сустракаецца імя Яна Ульрыхавіча Хозіюша, які займаўся ўзважваннем выбітых манет, хаця за гэту працу ён і не атрымліваў фінансавых выплат [4, с. 119]. Па некаторых звестках, непрацяглы час у сярэдзіне 1530-х гг. пасля смерці свайго бацькі ён займаў пасаду кіраўніка віленскай мынцы [10, с. 328].

Аб памерах эмісій мы можам даведацца з архіўных матэрыялаў. Так, за перыяд з 14 кастрычніка 1545 г. па 29 мая 1546 г. выбіта літоўскіх грошаў на суму 6 254 капы і 23 гроша, паўгрошаў – на 3 276 коп і 22 гроша, пенязяў – на 652 капы, 13 грошаў і 9 пенязяў, «малых пенязяў» – на 734 капы, 20 грошаў і 2 пенязя. Усяго: 10 917 коп, 19 грошаў і 1 пенязь. У перыяд з 12 чэрвеня 1546 г. па 30 снежня 1549 г. выбіта «малых пенязяў», пенязяў, паўгрошаў, польскіх грошаў, літоўскіх грошаў, траякоў і шастакоў на суму 281 722 польскіх злотых [11, с. 136].

У пэўныя часы мынца не дзейнічала праз недахоп сыравіны для вырабу манет. Так, напрыклад, у 1551 г. такіх перыядаў было агулам 17,5 тыдня, у 1552 г. – 22 тыдні, у 1553 г. – 11, у 1554 г. – 11, у 1555 г. – 17 [9, с. 105].

У першае дзесяцігоддзе прыбытак ад дзейнасці мынцы быў невялікім. Галоўныя выдаткі ішлі на закупку сыравіны, найперш срэбра і медзі, на выплаты заробкаў персаналу, на набыццё і рамонт меннічых прылад, на вугаль, соль, воск і інш. Гэта былі вялікія сумы. Прыбытак ад біцця манеты за перыяд з 14 кастрычніка 1545 г. па 29 мая 1546 г. складаў 61 польскі злоты, 2 грошы і 1 пенязь [12, с. 152–153]. Такім чынам, звесткі за гэты перыяд сведчаць аб малым прыбытку. З гэтай прычыны паны-рада больш не жадала займацца манетнай справай. Верагодна, такія абставіны выклікалі занепакоенасць Вялікага князя, які вырашыў узяць гэту справу ў свае рукі не для павышэння прыбытковасці, як сцвярджаў Я. Лютамірскі, а для таго, каб *«была біта добрая літоўская манета»* [2, с. 470]. З 12 чэрвеня 1546 г. па 30 снежня 1549 г. прыбытак склаў 4 689 злотых; у наступны перыяд да 1555 г. – 2 140 злотых, 26 грошаў і 8,5 пенязя [12, с. 152–153]. Агулам атрымліваецца, што за першыя дзесяць год (1545–1555 гг.) свайго функцыянавання мынца прынесла прыбытку ў памеры 6 900 польскіх злотых, што відавочна вельмі мала, бо вялікія сродкі пайшлі на пакупку будынка, абсталявання, меннічых прылад і інш. Гэта ўсё вымусіла Жыгімонта II Аўгуста асабіста ўмяшацца ў меннічыя справы.

У перыяд з 1 мая 1555 г. па 1562 г. з мэтай павелічэння прыбыткаў манетны двор быў аддадзены ў арэнду яўрэям.

## Бібліяграфічны спіс


1. Zagórski, I. Monety dawnej polski / I. Zagórski. – Warszawa, 1845. – V, 191, XVIII s.
2. Доўнар-Запольскі, М.В. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах / М.В. Доўнар-Запольскі; падрыхт. да друку: А.І. Груша, Р.А. Аляхновіч; увод. арт.: Д.У. Караў, А.У. Унучак, А.І. Груша; камент.: А.І. Груша, Ш.І. Бекцінееў, Л. Каралюс. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 759 с.
3. Grażyński, M. Mennica wileńska w latach 1545–1555 w świetle rachunków menniczych / M. Grażyński // Wiadomości Numizmatyczno–Archeologiczne. – 1912. – № 5. – S. 65–68.
4. Grażyński, M. Mennica wileńska w latach 1545–1555 w świetle rachunków menniczych / M. Grażyński // Wiadomości Numizmatyczno–Archeologiczne. – 1912. – № 8. – S. 119–122.
5. Gumowski, M. Mennica wileńska w XVI i XVII w. / M. Gumowski. – Warszawa, 1921. – 200 s.

6. Grażyński, M. Mennica wileńska w latach 1545–1555 w świetle rachunków menniczych / M. Grażyński // Wiadomości Numizmatyczno–Archeologiczne. – 1912. – № 6. – S. 81–83.
7. Tymieniecki, S. Wiadomości o mennicy Wileńskiej w XVI w. / S. Tymieniecki // Wiadomości Numizmatyczno–Archeologiczne. – 1889. – № 2. – S. 34–39.
8. Grażyński, M. Moneta swidnicka w Polsce / M. Grażyński // Wiadomości Numizmatyczno–Archeologiczne. – 1912. – № 3. – S. 37–39.
9. Grażyński, M. Mennica wileńska w latach 1545–1555 w świetle rachunków menniczych / M. Grażyński // Wiadomości Numizmatyczno–Archeologiczne. – 1912. – № 7. – S. 103–105.
10. Gumowski, M. Ulryk Hozjusz, ojciec kardynała, horodniczy wileński / M. Gumowski // Przegląd powszechny. – 1926. – T. 171. – S. 321–329.
11. Grażyński, M. Mennica wileńska w latach 1545–1555 w świetle rachunków menniczych / M. Grażyński // Wiadomości Numizmatyczno–Archeologiczne. – 1912. – № 9. – S. 135–136.
12. Grażyński, M. Mennica wileńska w latach 1545–1555 w świetle rachunków menniczych / M. Grażyński // Wiadomości Numizmatyczno–Archeologiczne. – 1912. – № 10. – S. 150–153.

## The Initial Period of Activity of the Vilnius Mint During the Reign of Sigismund II Augustus (1548–1572)

**Andrew KARACH,** NGO “Belarusian Numismatic Society”, Member of the Board, Republic of Belarus, Grodno, e-mail: andrew_karach@tut.by

**Abstract.** The article is devoted to a little-known page from the history of the Vilnius Mint of the mid-XVI century. The author localizes its location and dwells in detail on the issues of organizing the production, control and the issue itself. The important role of the assayer is noted.